**Статус Года кнігі, які нададзены 2012-му, наклаў адбітак асаблівай важнасці на ўсе мерапрыемствы ў краіне, звязаныя з друкаваным словам. І, безумоўна, гэты факт узяла на ўзбраенне сёлетняя XIX Міжнародная кніжная выстава-кірмаш у Мінску.**

# ПРЫЕМНЫЯ ІМГНЕННІ КНІЖНАЙ ВЫСТАВЫ

Па словах першага намесніка міністра інфармацыі Ліліі Ананіч, апроч разнастайных конкурсаў і фестываляў Год кнігі прадугледжвае стварэнне і ўмацаванне нарматыўна-прававой базы развіцця беларускага кнігавыдання. Падрыхтаваны да першага чытання праект Закона аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь, прадугледжваеццапрацягваць на ўзроўні новага Указу Прэзідэнта падтрымку нацыянальнай выдавецкай справы.



Ганаровым госцем сёлетняй выставы-кірмашу стала Венесуэла. У яе адкрыцці прымаў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Рэспубліцы Беларусь Амерыка Дзіас Нуньес. На вялікім цэнтральным стэндзе гэтай краіны, аздобленым жывым «вадаспадам», прайшла прэзентацыя кнігі «Венесуэла, зачараванне поўдня», выдадзенай на рускай і англійскай мовах Венесуэльскім інстытутам навуковых даследаванняў. Быў прадстаўлены новы збор твораў «Венесуэла і нафта», а наведвальнікі канферэнцыі змаглі пазнаёміцца з пісьменнікам Луісам Брытта Гарсіяй і старшынёй Цэнтра лацінаамерыканскіх даследаванняў імя Р.Гальегаса Раберта Эрнандэсам Мантоя. Дарэчы, плануецца, што ганаровым госцем наступнага года стане Іран, які прыняў удзел і ў гэтай выставе.

Акрамя Венесуэлы разгарнулі свае стэнды больш за 600 экспанентаў з 18 краін – нязначна менш за лічбы мінулага года. Расіяне сёлета прадставілі вялікі калектыўны стэнд. Пасольства Германіі і Інстытут Гётэ, якія вылучаюцца традыцыйна актыўным супрацоўніцтвам з рознымі беларускімі ўстановамі, склалі два стэнды нямецкага кнігавыдання. Сярод іншых удзельнікаў – Азербайджан, Арменія, Таджыкістан, Туркменістан ды інш.

Насычанай была праграма мерапрыемстваў, але мы звернемся да іх навуковага боку. У першы дзень выставы-кірмашу пісьменнік Уладзімір Ліпскі на стэндзе РВУ «Літаратура і Мастацтва» прадставіў сваю новую кнігу «Мужык» з серыі дакументальнай прозы. Прэзентацыя прайшла з удзелам яе героя – члена-карэспандэнта НАН Беларуси Аляксея Скакуна. Загадчык аддзела старажытнай культуры Беларусі ІМЭФ НАН Беларусі Барыс Лазука пазнаёміў гасцей выставы са сваёй чарговай кнігай з серыі «Гісторыя сусветнага мастацтва» – «Рускае і беларускае мастацтва XIX-XX стагоддзя». Таксама адбылася прэзентацыя першага тома «Літаратура XI-XVI стагоддзяў» з новай серыі кніг выдавецтва «Мастацкая літаратура» – «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» ў 50 тамах, у якой прыняў удзел акадэмік НАН Беларусі Уладзімір Гніламёдаў.

Важнай падзеяй XIX Мінскай выставы-кірмашу стала мерапрыемства на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – міжнародны «круглы стол» на тэму «Энцыклапедыя – пашпарт краіны. Задачы развіцця агульнай інфармацыйнай прасторы». Сярод абмеркаваных пытанняў былі традыцыі і тэндэнцыі, выданне энцыклапедый на новых платформах, праблемы стварэння і распаўсюджання энцыклапедычнай і даведачнай літаратуры на тэрыторыі краін-суседзяў, а таксама абмеркаванне нацыянальнага выдавецкага праекта «Энцыклапедыя рарытэтаў».




Працягваючы «энцыклапедычную» тэму, адзначым новае выданне «БелЭн», якое было прадстаўлена ў першы дзень выставы, – «Вялікі беларускі энцыклапедычны слоўнік». У прэзентацыі прымаў удзел акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя. Нагадаем, што акадэмічныя вучоныя цесна супрацоўнічалі з выдавецтвам пад час падрыхтоўкі слоўніка.

Выдавецкі дом «Беларуская навука» традыцыйна прапанаваў наведвальнікам шэраг сваіх апошніх выданняў. Як адзначыў яго дырэктар Аляксандр Сташкевіч, за мінулы год выдавецкі дом выпусціў больш за 120 найменняў кніг (з імі нашы чытачы маглі пазнаёміцца ў традыцыйнай рубрыцы на стар. 8). Тэмпы вытворчасці падаць не будуць. Акрамя акадэмічных прац «Беларуская навука» працягне выконваць заказы міністэрстваў, прасоўваць уласныя выдавецкія праекты. Адным з іх ужо стала сумесная з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі праца «Анталогія беларускай літаратуры» пачынаючы з X стагоддзя, якая карыстаецца попытам сярод студэнтаў і школьнікаў. Чарговым вынікам працы «Беларускай навукі» ў 2011-м з'явілася таксама прэзентацыя на выставе-2012 кнігі «Экран і культурная спадчына Беларусі» з удзелам аўтарскага калектыву і прадстаўнікоў беларускага кінематографа.

У бягучым годзе «Беларуская навука» плануе завяршыць выпуск шматтомных збораў твораў да 130-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа і Янкі Купалы і 100-годдзя Максіма Танка. З гэтай нагоды выдавецкі дом і Інстытут мовы і літаратуры імя Я.Коласа і Я.Купалы НАН Беларусі правялі ў межах сёлетняй выставы «круглы стол» на тэму творчасці класікаў беларускай літаратуры ў акадэмічным кнігавыданні. Таксама рыхтуецца да друку другая мастацкая кніга па гісторыі старажытнай Беларусі маладога пісьменніка Паўла Гацілава.

Узнагародай за ўжо зробленую працу ў мінулым годзе для «Беларускай навукі» стаў Дыплом першай ступені ў намінацыі «АРТ-Кніга» Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі-2012» за поспехі ў мастацка-тэхнічным аздабленні і паліграфічным выкананні за выданне кнігі «Бібліятэка Радзівілаў Нясвіжскай ардынацыі: каталог выданняў з фонду ЦНБ імя Я.Коласа НАН Беларусі, XV-XVI стст.». Дарэчы, на 13 намінацый конкурсу прэтэндавалі 190 кніг ад 40 выдавецтваў. Пераможцаў чакае экспаніраванне як на нацыянальным, так і на міжнародным узроўні.

**Алена БЯГАНСКАЯ**
**Фото аўтара, «Веды»**

**На фота: першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Радзькоў абмяркоўвае кнігі ВД «Беларуская навука», член-карэспандэнт А.Скакун і аўтар кнігі «Мужык» У.Ліпскі**